УДК 808.26-3

*А.А. ДЗЯЧЭНЯ*

# ТЭМАТЫЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ЛЕКСІКІ: ХРАНАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

У сучасным мовазнаўстве існуюць розныя падыходы да вытлумачэння агульных прынцыпаў будовы лексіка-семантычнай сістэмы мовы, што дапамагае даследчыкам лексічнай семантыкі адлюстраваць рэальную шматграннасць усемагчымых паводле сэнсавай блізкасці груповак слоў у мове.

Уступаючы ў розныя сэнсавыя і граматычныя сувязі, слова стварае сістэму. Вывучэнне сістэмнасці лексікі прадугледжвае выдзяленне розных паняццяў (семантычных палёў, лексіка-семантычных груп, сінанімічных радоў, анамасіялагічных груп). Акрамя пералічаных, А.М. Трубачоў прапаноўвае яшчэ вылучыць «прадметна-семантычную групу» (напрыклад, «час»).

Адным з прынцыпаў, пакладзеных у аснову класіфікацыі грамадска-палітычнай лексікі, з'яўляецца тэматычны прынцып, паводле якога размяжоўваюцца тэрміны ў працах І.Ф. Протчанкі, А.А. Бурачка, І.В. Рагозіна і А.А. Стрыжэнкі, Т.Б. Кручковай [1].

Тэматычныя аб'яднанні – такія групы слоў, якія належаць да адной прадметна-паняційнай сферы і з'яўляюцца блізкімі, рэферэнтна аднароднымі словамі. У аснову вылучэння такіх аб'яднанняў пакладзены знешнія сувязі паміж прадметамі і з'явамі матэрыяльнай рэчаіснасці.

У лінгвістычнай літаратуры тэрмін «тэматычная група» мае два значэнні:

1) рад слоў, аб'яднаных агульнасцю родавага значэння, г.зн. такіх слоў, што абазначаюць разнавіднасці аднаго і таго ж роду прадметаў;

2) рад слоў, якія больш-менш блізка супадаюць паводле свайго асноўнага семантычнага зместу, г.зн. паводле прыналежнасці да аднаго і таго ж семантычнага поля [2].

Іншы раз у аснову аналізу тэматычных груп як лексіка-семантычнай сукупнасці слоў кладуць прынцып выдзялення сем, заснаваны на парадыгматычных сувязях слоў. Пры гэтым эфектыўным сродкам з'яўляецца семантычнае накладванне блізкіх паводле значэння слоў. Такі аналіз дапамагае выдзеліць як агульныя часткі, так і іх рэшткі, якія дыферэнцыруюць значэнні слоў. У выніку выдзяляецца ідэнтыфікатар, які пры аналізе тэматычных груп прадстаўляе сабою і сукупнасць сем.

Часам лексіка-тэматычная класіфікацыя падмяняецца лексіка-семантычнай. Наогул у літаратуры да гэтага пытання няма адзінага падыходу, як і няма адзінага разумення яго сутнасці. На даволі вольнае карыстанне даследчыкамі названых вышэй тэрмінаў звяртае ўвагу і Ю.М. Караулаў [3, с. 314]. Прынцыповым жа адрозненнем іх, на наш погляд, з'яўляецца тое, што тэматычная класіфікацыя – гэта першапачатковы этап работы над лексікай, а лексіка-семантычная, хоць і заснавана на тэматычнай класіфікацыі, адлюстроўвае больш высокі ўзровень семасіялагічнага і анамасіялагічнага аналізу лексікі.

Прааналізаваўшы працы моваведаў, прысвечаныя разгляду тэматычных груп, можна выдзеліць некаторыя іх спецыфічныя асаблівасці.

На цесную сувязь тэматычных груп і пэўных адрэзкаў пазамоўнай рэчаіснасці ўказвалі Д.М. Шмялёў, Ф.П. Філін, І.П. Слесарава.

На аб'яднанні слоў у межах тэматычных груп пераважна з дэнататыўным тыпам значэння звярталі ўвагу Р.М. Карымава і Т.А. Кільдзібекава. П.М. Дзянісаў адзначае, што такія словы звычайна належаць да лексіка-граматычнага разраду назоўнікаў.

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

Аб лёгкасці вылучэння лексічнага значэння гаварылі Л.В. Быстрова, Н.Д. Капартрук і В.В. Лявіцкі.

На такую адметнасць, як суб'ектывізм, звярталі ўвагу Н.Г. Міхайлоўская, А.А. Уфімцава [4].

Увогуле ж межы паміж тэматычнай класіфікацыяй слоўнікавага складу і лексіка-семантычнай застаюцца неакрэсленымі. Цяжкасць іх размежавання заключаецца ў складанасці падзелу слоўнікавага складу пазамоўнага зместу. Агульнае паміж імі тое, што адна і другая група слоў адлюстроўваюць аб'ектыўную рэчаіснасдь, г.зн. і лексіка-семантычная група слоў мае сваю тэму і ў гэтым плане падзел паміж групамі немагчымы. Дарэчы, у межах адной тэматычнай групы існуюць больш дробныя, але цесна звязаныя паміж сабой лексіка-семантычныя групы слоў. Адрозненне паміж гэтымі групамі Ф.П. Філін бачыць у тым, што «лексіка-семантычныя групы слоў уяўляюць сабой вынік дзеяння законаў і заканамернасцей развіцця лексічнай семантыкі мовы, у той час як тэматычныя групы слоў, сама іх наяўнасць або адсутнасць у якой- небудзь мове, іх склад залежыць ад узроўню ведаў таго ці іншага народа-стваральніка і носьбіта мовы, ад умення класіфікавання з'яў рэчаіснасці, якія атрымалі свае слоўнікавыя абазначэнні" [5, с. 147].

У апошні час надаецца пэўная ўвага пытанню семасіялагічнага вывучэння тэматычных груп. Адны вучоныя (Д.М. Шмялёў, В.І. Блінава, Ю.С. Сцяпанаў) лічаць патрыбным аналізаваць тэматычныя групы слоў, другія (А.А. Уфімцава) падкрэсліваюць, што пры апісанні лексічнай сістэмы мовы трэба абапірацца толькі на семантычныя адносіны паміж лексемамі.

Такім чынам, тэматычная характарыстыка – найважнейшы метадалагічны прынцып, на аснове якога праводзіцца класіфікацыя і даследаванне лексікі наогул. Як ужо адзначалася вышэй, некаторыя лінгвісты адмоўна ставяцца да прапанаванай класіфікацыі, бо, на іх думку, у такім выпадку страчваюцца

семантычныя сувязі паміж лексемамі. Такі падыход да гэтай праблемы прыводзіць да абмежавання лінгвістычных задач. Аднак і эмпірычныя даследаванні, і працы названых вышэй моваведаў даюць падставы зрабіць вывад, што без прадметна-матэрыяльнай накіраванасці аналіз лексем будзе няпоўным. Так, І.В. Шадурскі адзначае, што "...мова па-свойму выдзяляе і групуе з'явы навакольнага свету, у сувязі з чым пазамоўная прадметна-паняційная характарыстыка слова ў многіх адносінах аказваецца звязанай з уласналінгвістычнай" [6, с. 50].

Падзел лексікі на тэматычныя групы дазваляе выдзеліць спецыфіку ўнутраных семантычных узаемаадносін паміж намінатыўнімі сродкамі мовы. Больш таго, такое апісанне груп стварае шырокія магчымасці для ўсебаковага вывучэння сэнсавых сувязей у мове, для дэталёвага выяўлення асаблівасцей семантычнай структуры асобных намінатыўных адзінак і лексіка-семантычнай сістэмы наогул. Заўважым, што тэматычны аналіз слоў з'яўляецца адным з самых распаўсюджаных метадаў вывучэння лексікі сучаснасці. Ён дапамагае вывучаць лексіку ў гістарычным аспекце, даследаваць семантычныя асаблівасці кожнай групы, разглядаць моўныя адзінкі ў пэўнай сістэме, супастаўляць з лексемамі іншых крыніц розных часоў, вызначаць лексічны ўзровень даследуемых крыніц. Яшчэ больш актуальная тэматычная характкарыстыка ў грамадска-палітычнай тэрміналогіі, бо нават сама грамадска-палітычная лексіка даволі істотна адрозніваецца ад семантычнай структуры навуковых тэрмінаў і лексем. У першую чаргу – сваёй семантычнай акрэсленасцю, таму што ў значэннях апошніх істотныя прыметы з'яў і аб'ектаў рэчаіснасці, якія яны абазначаюць, найбольш прадстаўлены. Калі пры даследаванні тэхнічных, прыродазнаўчых з'яў сам аб'ект застаецца стабільным, а мяняецца толькі глыбіня ведаў аб ім, то грамадска-палітычныя

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

з'явы і працэсы знаходзяцца ў пастаянным руху, развіцці. І гэтая акалічнасць абмяжоўвае магчымасць фіксацыі істотных прымет вывучаемага аб'екта.

На структуру грамадска-палітычнага паняцця могуць уплываць і пэўныя нацыянальныя, класавыя інтарэсы, г. зн. паняцце можа быць ідэалагічна рэвалентным і ў выніку неакрэсленым.

У такіх выпадках тэматычная класіфікацыя і дапамагае вызначыць сэнсавую структуру паняцця на пэўным этапе яго развіцця, яго ўнутраную спецыфіку, а іншы раз і сэнсавыя сувязі з іншымі тэматычнымі групамі.

Грамадска-палітычная лексіка сучаснага перыяду з'яўляецца ў нейкай ступені якасна новым лексічным пластом, які адлюстроўвае грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены ў нашай краіне. Пра гэта сведчыць і тэматычная разнастайнасць даследаванняў. У апошні час з'явілася шмат прац, прысвечаных вывучэнню грамадска-палітычнай лексікі, дзе ўвага надаецца як разгляду гэтага разраду слоў у мове асобных пісьменнікаў, так і апісанню грамадска-палітычнай лексікі пэўнага прамежку часу.

Першыя спробы тэматычнай класіфікацыі грамадска-палітычнай лексікі былі зроблены даследчыкамі ў 50-х гадах XX ст. у працах С.Р. Ільенка і М.К. Максімавай, якія, аналізуючы новыя грамадска-палітычныя словы паслякастрычніцкага перыяду, выдзяляюць 16 асноўных тэматычных груп: 1) словы, якія звязаны з партыйным будаўніцтвам; 2) назвы ўстаноў, грамадскіх арганізацый і іх прадстаўнікоў; 3) словы, якія абазначаюць новую сістэму і арганізацыю сельскай гаспадаркі і яе прадстаўнікоў; 4) словы, што абазначаюць прыёмы і метады работы, а таксама людзей, якія выкарыстоўваюць гэтыя метады і прыёмы; 5) словы, якія абазначаюць формы правядзення грамадска-масавай працы і яе дзеячаў; 6) словы, што абазначаюць грамадска-палітычныя рухі і іх прадстаўнікоў; 7) словы, якія звязаны з выбарчай сістэмай грамадскіх арганізацый; 8) словы, якія звязаны з усталяваннем новага светапогляду, новага маральнага вобліку людзей; 9) словы і словазлучэнні, якія звязаны з сістэмай заахвочвання працоўнай і баявой доблесці; 10) словы, што абазначаюць назвы класавых і сацыяльных праслоек; 11) словы, звязаныя з новай сістэмай арганізацыі народнай адукацыі; 12) словы, якія звязаны з абазначэннем перыядызацыі; 13) словы, якія звязаны з новым адміністрацыйным дзяленнем; 14) словы, што абазначаюць варожыя выступленні супраць Савецкай улады і іх прадстаўнікоў; 15) словы, якія абазначаюць назвы агульнанародных і сямейных святаў; 16) словы, якія звязаны з крытыкай адмоўных з'яў у грамадска-палітычным жыцці.

Ужо пры першых спробах класіфікацыі грамадска-палітычнай лексікі даследчыкі звярнулі ўвагу на цяжкасць выдзялення тэматычных груп, а таксама ўказваюць на рухомасць і ўмоўнасць межаў паміж групамі. Падобную тэматычную класіфікацыю грамадска-палітычнай лексікі прапаноўвае П.К. Мільшын. Аўтар аб'ядноўвае некаторыя групы, прапанаваныя С.Р. Ільенка і М.К. Максімавай і вылучае 6 тэматычных глаў. Падабенства класіфікацый заключаецца ў тым, што аўтары характарызавалі грамадска-палітычныя словы аднаго і таго ж прамежку часу, адной і той жа краіны, пры існаванні аднаго і таго ж ладу грамадскага жыцця і ідэалогіі.

Класіфікацыя, прапанаваная І.Ф. Протчанкам, добра адлюстроўвае савецкую рэчаіснасць (70-я гады XX ст.), сацыялістычную ідэалогію, аднак па-за межамі яе застаюцца грамадска-палітычныя з'явы і рэаліі іншых грамадскіх сістэм і міжнародных зносін.

Класіфікацыя, праведзеная А.А. Бурачком, у нечым перакрыжоўваецца з класіфікацыяй, прапанаванай І.Ф.Протчанкам. І гэта не выпадкова: абодва даследчыкі працавалі ў адну эпоху, пры існаванні аднаго і таго ж ладу грамадства і

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

той жа ідэалагічнай накіраванасці. І А.А. Бурачок, І.Ф. Протчанка да разглядаемага пласта адносяць таксама і словы, сэнсава звязаныя са сферай матэрыяльнай вытворчасці. Дарэчы, А.А. Бурачок, увёўшы палітычна-эканамічную, палітычна-юрыдычную, палітычна-філасофскую і ваенную лексіку значна пашырыў тэматычную класіфікацыю, прапанаваную І.Ф. Протчанкам. Аднак Т.Б. Кручкова выступае супраць уключэння ваеннай лексікі ў разрад грамадска-палітычнай лексікі.

Існуюць і іншыя погляды на класіфікацыю грамадска-палітычнай лексікі. Так, напрыклад, 80-я гады 20 ст. прадстаўляе класіфікацыя Т.Б. Кручковай, якая прапаноўвае наступную схему аналізу грамадска-палітычнай лексікі:

1) словы, што абазначаюць розныя рэаліі і з'явы знешняй палітыкі; 2) словы, што абазначаюць рэаліі і з'явы ўнутрыпалітычнага жыцця краіны; 3) назвы розных дзяржаўных, партыйных і іншых грамадскіх арганізацый і ўстаноў, сацыяльных інстытутаў, службовых асоб і г. д. 4) найменні розных з'яў грамадскага жыцця, сацыяльных рэалій і г.д., характэрных для таго ці іншага грамадскага ладу. Аўтар адзначае, што такая класіфікацыя можа быць больш дэталёвай для моў, якія функцыянуюць у розных сацыяльных умовах і выдзеленыя тэматычныя падгрупы будуць рознымі .

Прааналізаваўшы англамоўную грамадска-палітычную лексіку, І.Б. Рагозін і А.А. Стрыжэнка выдзяляюць зусім іншыя групы слоў: даследчыкі сутыкнуліся з іншай сістэмай грамадскага ладу, палітычнай накіраванасцю, культурай і мовай: 1) словы, звязаныя з функцыянаваннем дзяржаўнай улады; 2) словы, што абазначаюць лозунгі, дактрыны, палітычныя рухі і напрамкі; 3) словы, якія адносяцца да агульнапалітычнай дзейнасці сістэмы; 4) словы, звязаныя з функцыянаваннем дзвюхпартыйнай сістэмы; 5) словы, звазаныя з сістэмай выбараў.

Як бачым, ніхто з названых даследчыкаў не ўключыў у склад грамадска-палітычнай лексікі словы з галіны эканомікі. Цікавы той факт,што з узяццем курсу на дэмакратызацыю нашай краіны, са зменамі ў дзяржаўнай сістэме і яе дзейнасці словы, якія ўключаліся ў групу "рэаій і з'яў, звязаных з жыццём замежных краін," уліліся ў рэчаіснасць нашага жыцця.

Улічваючы вопыт папярэднікаў у складанні тэматычных класіфікацый грамадска-палітычнай лексікі і абагульняючы яго, Т. Амаду прапаноўвае якасна новую схему аналізу гэтай лексікі і выдзяляе тры катэгорыі:

1) грамадска-палітычная лексіка, якая адлюстроўвае ўнутранае жыццё краіны; 2) лексіка нацыянальнай і сацыяльна-вызваленчай барацьбы; 3) грамадска-палітычная лексіка, якая адносіцца да міжнароднага жыцця [7].

Выдзяляючы гэтыя катэгорыі, даследчык свядома імкнуўся, на наш погляд, да схематычнасці, агульнасці пры характарыстыцы грамадска-палітычнай лексікі і грамадска-палітычнай тэрміналогіі,і, карыстаючыся гэтай схемай, можна ў агульным плане ахарактарызаваць грамадска-палітычную лексіку любой сучаснай краіны і пэўнага прамежку часу, і пры гэтым адзначыць асноўныя спецыфічныя рысы, асаблівасці ўжывання і выкарыстання грамадска-палітычнай лексікі. Аднак поўнага ахопу гэтай лексікі пры такім аналізе мы не атрымаем. Таму што аўтар пры вызначэнні межаў грамадска-палітычнай лексікі прапаноўвае выключыць з яе разраду прававую, гістарычную, філасофскую, палітэканамічную, рэлігіёзную,атэістычную, мастацказнаўчую, літаратурнакрытычную, тэрміналагічную і карыстацца тэрмінам "уласна грамадска-палітычная лексіка". Пад якім разумее словы, што называюць паняцці дзяржаўнасці і дзяржаўнага ўладкавання, органы дзяржаўнай улады і іх элементы, а таксама словы, звязаныя з іх функцыянаваннем, адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем дзяржаўных тэрыторый, грамадскім ладам і сацыяльнай структурай

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

грамадства, яго партыйнымі, прафсаюзнымі і іншымі грамадскімі аб'яднаннямі, структурай і дзейнасцю гэтых арганізацый; словы, што служаць найменнямі паняццяў, якія звязаны з правамі і абавязкамі членаў грамадства і іх барацьбой за гэтыя правы, з рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбой, з міжнароднымі адносінамі і іх інстытутамі, а таксама з найбольш істотнымі для ўсяго чалавецтва паняццямі барацьбы за мір, разрадкі напружанасці, самастойную незалежную дзяржаўную палітыку.

На 90-я гады XX ст. прыпадаюць значныя сацыяльныя і палітычныя зрухі ў жыцці нашай краіны, а гэта, у першую чаргу, уплывае на пэўныя змяненні ў межах грамадска-палітычнай лексікі. Прааналізаваны фактычны матэрыял дазваляе нам выдзеліць наступныя тэматычныя групы: 1) словы, звязаныя з міжнароднай палітыкай; 2) назвы, звязаныя з дзейнасцю адміністрацыі прэзідэнта, з сістэмай выбараў; 3) назвы дзяржаўных арганізацый і ўстаноў, палітычных партый і плыняў, грамадскіх рухаў (назвы асоб па прыналежнасці да іх, а таксама мерапрыемстваў і формаў іх работ); 4) словы, звязаныя з функцыянаваннем дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь; 5) назвы, звязаныя з прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасцю; 6) назвы, што абазначаюць станоўчыя і адмоўныя факты і з'явы ў грамадска-палітычным, эканамічным, культурным жыцці краіны; 7) галіна дзіцячага і маладзёжнага руху і яго дзейнасць.

Акрамя тэматычных класіфікацый пэўнага прамежку часу, існуюць таксама тэматычныя класіфікацыі грамадска-палітычнай лексікі, выкарыстанай у мове твораў асобных пісьменнікаў. Так, напрыклад, В.М. Самкова класіфікуе грамадска-палітычную лексіку твораў А.М. Герцэна, А.М. Мелярові ч – літаратурнага помніка невядомага прыгоннага селяніна "Весці аб Расіі", Н.В. Ярмолава – твораў К.Ф. Рылеева, М.А. Булавіна – публіцыстыкі рэвалюцыйных народнікаў.

Сустракаюцца працы, дзе аўтары даследуюць адну з галін грамадска-палітычнай лексікі. Так, Л.М. Красільнікаў аналізуе лексіку сферы міжнародных зносін.

Такім чынам, тэматычная класіфікацыя даволі распаўсюджана пры аналізе грамадска-палітычнай лексікі і грамадска-палітычнай тэрміналогіі і з'яўляецца яе неад'емнай часткай, таму што дапамагае не толькі пры абмежаванні і ўдакладненні межаў гэтай лексікі, але і ўказвае на яе шматграннасць.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Протченко И.Ф.*** Развитие общественно-политической лексики в советскую эпоху. Развитие лексики современного русского языка. – М.: Наука, 1965; ***Бурячок А.А.*** Формирование общего фонда социально-политической лексики восточнославянских языков. Автореферат на соискание ученой степени доктора филологических наук. Киев,1984; ***Рагозина И.В. Стриженко А.А.*** Политическая лексика англоязычной прессы: Учебное пособие. – Барнаул: Изд-во АГУ, 1983; ***Крючкова Т.Б.*** Особенности формирования и развития общественно-политической лексики и терминологии. – М., 1989.
2. ***Ахманова О.С.*** Словарь лингвистических терминов. Изд. 2-ое, стереотип. – М.: Сов. Энциклопедия, 1969.
3. Принципы описания языков мира. – М., 1969.
4. ***Шмелев Д.Н.*** Проблемы семантического анализа лексики. – М., 1973; ***Филин Ф.П.*** Очерки по теории языкознания. – М., 1982; ***Слесарева И.П.*** Проблемы описания и преподавания русской лексики. – М., 1980; ***Каримова Р.А., Кильдзибекова Т.А.*** Тематическая группа слов как объект исторической лексикологии // Исследования по семантике. – Уфа, 1976.; ***Денисов П.Н.*** Место и роль самых многозначных слов в лексической системе языка. – М., 1982; ***Быстрова Л.В., Капатрук Н.Д., Левицкий В.В.*** К вопросу о принципах и методах выделения лексико-семантических групп слов // Филологические науки. – М., 1980. – № 6; ***Михайловская Н.Г.***


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

К проблеме семантического членения словарного состава // Актуальные проблемы лексикологии. – Мн.,1970; ***Уфимцева А.А.*** Слово в лексико-семантической системе языка. – М., 1968.

5. ***Филин Ф.П.*** О лексико-семантических группах слов // ***Норман Б.Ю., Павленко Н.А.*** Введение в языкознание. Хрестоматия. – Мн.: Выш. шк., 1984.
6. ***Шадурский И.В.*** Тематическое изучение лексики. – Мн., 1975.
7. ***Амаду Т.*** Общественно-политическая лексика современного русского литературного языка: Лексико-семантический и структурный анализ: Автореф. дисс. ... канд. филол. наук. – Л., 1981.

SUMMARY

*The article considers a thematical principle of socio-political terms' classification, the chronological aspect of using the principle being analysed by the author.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова